# МІСІЯ — ТАТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Цудоўна памятаю *(усміхаецца)*. Мяне зашывалі ў той момант на крэсле. А Сашу прынеслі дзіця. Ён адклаў убок фотакамеру, каб узяць сына на рукі. А я кажу: «Давай я цябе сфатаграфую». Саша – доктар па адукацыі. Яму аднойчы нават давялося прымаць экстранныя роды ў машыне хуткай дапамогі. Але калі справа дайшла да нараджэння ўласнага дзіцяці, і мы выбралі парныя роды... Я вельмі гучна рэагавала, і чула, як Саша, стоячы ў дзвярах, шаптаў: «Цішэй, цішэй». Ён так перажываў, хваляваўся...

— Так, я бачыў роды раней, але ў выпадку з маёй сям'ёй гэта былі зусім іншыя перажыванні, — кажа Аляксандр Ждановіч. — Сустрэць сваё дзіця ў першыя секунды яго жыцця значыла для мяне многае. Вось ты трымаеш на руках маленькі камячок і разумееш, што з гэтага часу тваё жыццё ўжо не будзе ранейшым. І жыццё сапраўды змяняецца ў лепшы бок. Партнёрскія ж роды дапамаглі мне ўсвядоміць сваё бацькоўства глыбей, у эмацыянальным плане.

**«Звычайна прынята сцвярджаць, што «дзіцяці патрэбен бацька», але рэдка можна пачуць, што бацьку гэтак жа патрэбнае дзіця...»**

**— Аляксандр, а што змянілася ў вашым жыцці са з'яўленнем Марэка і Яна?**

— З'явілася патрэба жыць усвядомлена, станавіцца больш мудрым, больш цярплівым. Недзе 4 гады таму ў мяне быў крызісны стан, калі я зразумеў, што мае адносіны з дзецьмі заходзяць у тупік. І пачаў шукаць выйсце: слухаў шмат лекцый па псіхалогіі — мужчынскай, жаночай, дзіцячай, узаемаадносінах унутры сям'і. У выніку зразумеў, што трэба перастаць выхоўваць дзяцей і пачаць выхоўваць сябе. Бо, што б ты ім ні казаў, яны ўсё роўна будуць браць прыклад з цябе.

— Тата — гэта мадэль таго, як дзеці будуць сябе паводзіць у далейшым, — дадае Ганна. — Як правільна заўважыў яшчэ адзін удзельнік фотапраекта Кірыл Будоўскі (уладальнік і дырэктар кавярні «Зерне»), «бацька важны для дзяцей яшчэ і тым, што вучыць сына быць мужчынам, а дачцэ перадае праграму адносін да мужчыны. І тут недастаткова навучыць дзіця забіваць цвік і купіць дзяўчынцы цукерак, тут усё больш сур'ёзна». Дзеці бачаць, як тата праяўляе сябе ў адносінах да мамы, да суседзяў, да калег па працы. Калі вырастуць, яны ўжо будуць мець вызначаную схему адносін, у тым ліку і сямейных. Не факт, канешне, што ў іх атрымаецца стварыць менавіта такую сям'ю, як у бацькоў, але мадэль, якую яны бачылі, у многім будзе вызначальнай.

## «Дочкі дазволілі мне стаць сентыментальным»

**— Кажуць, што жанчыны адразу адчуваюць непапраўную любоў да сваіх дзяцей. У мужчын жа ўсё па-іншаму: да іх гэтае пачуццё прыходзіць з часам...**

— Думаю, ва ўсіх па-рознаму. Што тычыцца Сашы, то, калі мы пазнаёміліся, ён ужо быў увесь у дзецях. Ездзіў урачом у піянерскія летнікі, пляменнікі яго абажалі. Ледзь паспеем выйсці ў двор — малыя тут як тут, з усіх бакоў яго абляпілі. Гэта той выпадак, калі чалавек першапачаткова вельмі любіў дзяцей. Магчыма, таму што Саша сам рос без таты...

**«Зразумеў, што трэба перастаць выхоўваць дзяцей і пачаць выхоўваць сябе. Бо, што б ты ім ні казаў, яны ўсё роўна будуць браць прыклад з цябе».**

Але не ва ўсіх мужчын так. Вось, напрыклад, фатограф Дзіма Аганесян прызнаўся, што не адразу адчуў радасць бацькоўства. «Памятаю, — кажа, — забіраў жонку і дачку з раддома і вельмі смуткаваў, што не адчуваў нейкай бязумоўнай любові да свайго дзіцяці — думаў, што са мной нешта не так. Але мінула паўгода, і я нейк спакойна і ўпэўнена выявіў унутры сябе цяпло і любоў да гэтага маленькага чалавечка». Думаю, падобная сітуацыя нармальная, і многія мужчыны спачатку не адчуваюць таго, што адчуваюць жанчыны. Не трэба палохацца, варта быць адкрытым, шчырым, і з часам пачуццё напоўніць вас.



Фота Ганны ТРУБАЧОВАЙ.

Аляксандр ЖДАНОВІЧ упершыню трымае сына пасля парных родаў.



Валерый ЗАГОРСКІ, бізнесмен, 43 гады, двое дзяцей (дачка 20 гадоў, сын 1,5 года): *«Дачка ўжо вырасла і, пакінуўшы бацькоўскі дом, пачала сваё ўласнае дарослае жыццё. З яе ад'ездам з'явілася нейкая пустата ўнутры, якую людзі звычайна запаўняюць усякім глупствам. Сын вярнуў мяне ў іншае жыццё: я зразумеў, што важна, а што не. Пачаў клапаціцца пра сваё здароўе, думаць пра тое, што ндрэнна б пажыць даўжэй, бо ты патрэбен дзіцяці ў бліжэйшыя 20 гадоў».*

## МЕРКАВАННЕ НА ТЭМУ

**Святлана БЕЛАШ, кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі:** «Даказана, што тыя дзеці, якія адчулі клопат і любоў таты, больш эмацыянальна ўстойлівыя, менш агрэсіўныя, пазітыўней успрымаюць жыццё. Таму хацелася б, каб беларускія мужчыны больш актыўна прымалі ўдзел у выхаванні сваіх сыноў і дачок. Летась толькі 1% татаў і дзядуляў (гэта крыху больш за 3 тысячы чалавек) скарысталіся сваім законным правам на водпуск па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Таму мы задумаліся наконт мэтазгоднасці ўвядзення абавязковага дэкрэтнага водпуску для мужчын. З ліпеня гэтага года пачнём вывучаць заканадаўчую практыку іншых краін па гэтым пытанні».

**Алена КАСЬКО, намеснік старшыні Фонда ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі:** «Каб статыстыка змянілася ў лепшы бок, трэба ў першую чаргу мяняць стэрэатыпы мыслення, якія пануюць у нашым грамадстве. Ёсць працэнт мужчын, якія хацелі б пайсці ў дэкрэтны водпуск. Але не адважваюцца, бо баяцца, што іх могуць палічыць няўдачнікамі. Мы вельмі рады, што на дзяржаўным узроўні разглядаецца магчымасць увядзення абавязковага дэкрэтнага водпуску для татаў. Яшчэ і таму, што нашы мужчыны жывуць у сярэднім на 11 гадоў менш за жанчын. Даследаванні ж паказваюць, што таты, якія ўцягнуты эмацыйна і фактычна ў выхаванне дзіцяці, пачынаюць весці менш рызыкоўны лад жыцця.

Акрамя таго, у многіх заходнееўрапейскіх краінах існуе абавязковы бацькоўскі кароткатэрміновы адпачынак пры нараджэнні дзіцяці. Мне здаецца, было б цудоўна, калі б Беларусь разгледзела такую магчымасць. Бо першыя дні, калі дзіця вяртаецца з мамай з раддома, самыя адказныя і хвалюючыя. Таму вельмі важна, каб тата эмацыянальна быў побач.

## ДАРЭЧЫ

Беларускія жанчыны на догляд дзяцей і хатнія клопаты трацяць у два разы больш часу, чым мужчыны. А гэта значыць, што ў іх застаецца ў два разы менш часу на сябе і на сваё самаразвіццё...



Уладзімір ГЛОТАЎ, акцёр, 33 гады, дзве дачкі (4 і 7 гадоў): *«У нас няма такога, што я прыйшоў з працы, скінуў шкарпэткі і ўткнуўся ў камп'ютар, а жонка — у свой камп'ютар, а дзеці — у планшэты — не, гэта не сям'я».*

**— Акрамя таго, у нас чамусьці прынята лічыць, што мужчыны не павінны адкрыта праяўляць свае пачуцці, павінны ўсё трымаць у сабе...**

— Гэта разбуральныя стэрэатыпы. Таму я вельмі радавалася, калі чула ад герояў праекта адваротнае. Так, Валерый Дасюкевіч (бас-гітарыст гурта J:МОРС), які, дарэчы, зараз знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску па доглядзе сына, сказаў: «Лаўлю сябе часам на думцы, што мне вельмі хацелася б, каб мой бацька паводзіў сябе са мной так жа, як я са сваім сынам. Бацька не праяўляў пачуццяў да мяне, а я ж — наадварот, да перагібаў часам: я больш, чым, можа, трэба, турбуюся пра тое, каб сын своечасова і добра паеў, паспаў дастаткова, выконваў рэжым дня, не дай Бог не пашкодзіў сабе штосьці. Асабіста мне вельмі складана зразумець, як можна не праяўляць пачуццяў да свайго дзіцяці, не гаварыць яму пра тое, як моцна ты яго любіш. Мне здаецца, гэта жыццёва неабходна як для дзіцяці, так і для таты». Акцёр Уладзімір Глотаў прызнаўся, што дочкі дазволілі яму стаць вельмі сентыментальным. І цяпер ён рыдае разам з імі над фільмамі, любуецца захадамі сонца... «Бацькоўства дало мне магчымасць быць колькі заўгодна пяшчотным, але, з іншага боку, я адказны, клапачуся пра дачок, я ўвесь час прымаю рашэнні. Напрыклад, трэба прыняць рашэнне, якую кветку сарваць: гэту можна, а гэту нельга, таму што адна вялікая, а другая яшчэ маленькая, адна — у полі, а другая на клумбе каля будынка парламента — тата павінен не толькі прымаць рашэнні рознага маштабу, але і тлумачыць іх дзецям».

**«Я дагэтуль бачу ў пясочніцах, як кантактуюць бацькі з дзецьмі: камандны тон, фізічна караюць проста на вуліцы. Гэта тое, з чаго варта пачынаць мяняць сітуацыю».**

## Маму трэба падмяняць

**— Наколькі ведаю, у некаторых мужчын бацькоўства асацыюецца выключна з вельмі складаным і бязрадасным абавязкам...**

— Гэты аднабаковы стэрэатып таксама навязаны грамадствам. Звычайна прынята сцвярджаць, што «дзіцяці патрэбен бацька», але рэдка можна пачуць, што бацьку гэтак жа патрэбнае дзіця... Як сказаў музыка і тата чатырох дзетак Зміцер Вайцюшкевіч, «толькі дзеці здольныя навучыць дарослых страчаным навыкам бачыць прастату жыцця, быць наіўнымі і шчырымі, давераць свету і адзін аднаму». Размаўляючы з героямі фотапраекта, я бачыла, як кожны з іх абагачаецца ад бацькоўства. Бачылі б вы, як Віталь Артыст (саліст групы «Без білета») расказваў пра тое, як ён з дочкамі па чарзе запускаюць квадракоптар. Ці пра тое, як нядаўна падарыў дачцэ аўтамабіль на радыёкіраванні, які разганяецца да 60 км/гадзіну, а радыёсігнал ловіць на адлегласці 2 кіламетраў! «Мы пастаянна гуляем разам, у настольныя і вулічныя гульні, кудысьці ездзім, выдатна праводзім час. Дзякуючы дочкам я захаваў унутры сябе шчаслівае і бесклапотнае дзіця, якое бачыць вакол прыгажосць і яркія фарбы жыцця. Ёсць і абавязкі, вядома: так, у спісе маіх добраахвотных абавязкаў заўсёды было чытанне, танцавальныя імправізацыі, складанне музыкі, здыманне мультфільмаў на тэлефон, праходжанне квэстаў і кінапаходы».

**— Ганна, але ўсё ж такі, на ваш погляд, чыя роля ў сям'і больш важная — мамы ці таты?**

— Важна, каб выхаваннем дзяцей займаліся абое. Так узрастае верагоднасць таго, што вырасце паўнавартасная асоба. Бо я, як жанчына, напрыклад, не магу падзяліцца з дзецьмі мужчынскай энергіяй, і наадварот. Ды і што тут казаць, Саша нават тлумачыць па-іншаму. Акрамя таго, не толькі тата, але і мама мае права на сваю ўласную прастору, захапленні, заняткі. Таму трэба адзін аднаго падмяняць, дапаўняць. А пакуль што лічыцца, што выхоўваць дзяцей — гэта доля выключна жанчыны. Культура бацькоўства ў нас, на жаль, пакуль нізкая. Я дагэтуль бачу ў пясочніцах, як кантактуюць бацькі з дзецьмі: камандны тон, фізічна караюць проста на вуліцы. Гэта тое, з чаго варта пачынаць мяняць сітуацыю. Павінна быць больш станоўчых прыкладаў. І гэта фотавыстава — адзін з іх.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Аляксандра ЖДАНОВІЧА.**

**Аўтар выказвае падзяку ЮНФПА ў Беларусі за прадастаўленыя фотаздымкі.**